Нацыянальная платформа

Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# ЗАЯВА
# БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПЛАТФОРМЫ ФОРУМА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

*2 сакавіка 2012 г.*

*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мы, удзельнікі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, выказваем глыбокую занепакоенасць з нагоды дыпламатычнага канфлікта паміж уладамі Беларусі і Еўрапейскім Саюзам.*

Узнікшая зараз сітуацыя з’яўляецца толькі “верхавінай” канфлікту, падставы для якога былі створаны дзеяннямі беларускіх уладаў па разгоне дэманстрацыі 19 снежня 2010 г. і далейшымі рэпрэсіямі супраць беларускай палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці. Мы разглядаем рэакцыю беларускіх уладаў на рашэнне Рады ЕС пашырыць спіс беларускіх чыноўнікаў, у дачыненні да якіх дзейнічаюць візавыя абмежаванні, як незбалансаваную і шкодную для беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Такая рэакцыя ўмацоўвае атмасферу недаверу і варожасці паміж Беларуссю і Еўрапейскім Саюзам, што вядзе да далейшага абвастрэння супярэчнасцей замест прадуктыўнага дыялога і пошука механізмаў узаемнакарыснага супрацоўніцтва і добрасуседства.

Еўрапейскі Саюз з’яўляецца сталым і надзейным партнёрам беларускай грамадзянскай супольнасці на шляху дэмакратызацыі і рэфармавання нашай краіны. У прыватнасці, адказныя структуры Еўрасаюза прадэманстравалі важную для нас прынцыповасць і паслядоўнасць у патрабаванні вызвалення палітычных вязняў і ліквідацыі наступстваў падзей 19 снежня 2010 г. Салідарная пазіцыя дыпламатычных прадстаўніцтваў краін Еўрапейскага Саюза ў Беларусі, прыняўшых рашэнне аб сумеснай рэакцыі ў рамках узнікшага дыпламатычнага канфлікта была натуральным адказам на палітычныя захады беларускіх уладаў. Пры гэтым мы бачым небяспечнай і шкоднай далейшую эскалацыю канфлікта і лічым недапушчальным яго пераўтварэнне ў першасную праблему беларуска-еўрапейскіх стасункаў.

Спрэчкі па дыпламатычных супярэчаннях паміж уладамі Беларусі і Еўрасаюзам адцягваюць увагу ад па-сапраўднаму важных аспектаў беларуска-еўрапейскіх адносінаў. Такім чынам, гэты канфлікт павялічвае адрыў Беларусі ад Еўропы, яго далейшае развіццё прывядзе да паглыблення самаізаляцыі краіны на міжнароднай арэне, пагоршыць умовы жыцця і пазбавіць еўрапейскіх перспектываў грамадзянаў Беларусі. Каб Беларусь

захавалася і развівалася як незалежная дзяржава, ёй патрэбна еўрапейская перспектыва, праца па набліжэнні да нормаў і стандартаў Еўрасаюза, дапамога ў правядзенні мадэрнізацыі.

**Прымаючы пад увагу ўсё вышэйсказанае і разумеючы адказнасць беларускіх уладаў за стварэнне канфліктнай сітуацыі, мы заклікаем кіраўніцтва Беларусі і Еўрапейскага Саюза ўстрымацца ад далейшай эскалацыі гэтага канфлікта і пераўтварэння яго ў абмен ударамі па прынцыпе "вока за вока". Мы таксама перакананыя, што простага замарожвання канфлікту будзе недастаткова.**

Беларускія ўлады павінны прадэманстраваць імкненне Рэспублікі Беларусь выконваць свае міжнародныя абавязацельствы ў галіне грамадзянскіх і палітычных правоў. Дзеяннямі, якія б сведчылі аб гатоўнасці да канструктыўнага перамоўнага працэсу, мусіць быць вызваленне з беларускіх турмаў палітычных вязняў і ўстрыманне ад новых рэпрэсіяў. Мы заклікаем улады Беларусі адмовіцца ад стратэгіі канфрантацыі і распачаць рэальны перамоўны працэс унутры краіны, што стане найлепшым падмуркам для нармалізацыі становішча, у тым ліку і на беларуска-еўрапейскім накірунку.

Мы таксама чакаем ад Еўрапейскага Саюза далейшай рэалізацыі паслядоўнай і дальнабачнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі, не абмяжоўваючыся толькі рэагаваннем на крокі беларускага кіраўніцтва. Еўрасаюз мусіць праявіць сваю прынцыповасць не толькі ў пазыцыі, але і ў дзеянні, нават пры неспрыяльных умовах рабіць далейшыя крокі па ўцягванні Беларусі як краіны-суседа ў еўрапейскую арбіту. Хуткім, прынцыповым і відавочна пазытыўным крокам у такой сітуацыі магла б стаць поўная адмена консульскіх збораў за выдачу візаў краінаў Еўрасаюза беларускім грамадзянам.

*Прадстаўнікі беларускай грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнерства, перакананыя, што толькі вырашэнне сутнасна істотных пытанняў рэфармавання і мадэрнізацыі краіны, вяртання яе ў сям'ю еўрапейскіх супольнасцяў, можа быць пакладзенае ў аснову перамоваў і пераадолення існага канфлікту паміж уладамі Беларусі і Еўрапейскім Саюзам.*

*Подпісы:*

*Уладзімір Мацкевіч*, Старшыня Часовага каардынацыйнага камітэта (ЧКК) Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

*Сяргей Лісічонак*, Нацыянальны каардынатар Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства па Беларусі

*Яраслаў Бекіш*, сябра ЧКК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, каардынатар трэцяй працоўнай групы Форума

*Уладзіслаў Вялічка*, сябра ЧКК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Міжнародны кансорцыум «ЕЎРАБЕЛАРУСЬ»

*Андрэй Ягораў*, сябра ЧКК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Навукова-даследчая ўстанова «Аналітычная група ЦЕТ»

*Сяргей Драздоўскі,* сябра ЧКК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Асветніцкая праваабарончая ўстанова «Офіс па правах людзей з інваліднасцю»

*Сяргей Мацкевіч,* сябра ЧКК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Асамблея НДА Беларусі

*Алена Танкачова*, Асветніцкая ўстанова «Цэнтр прававой трансфармацыі»

*Вольга Смалянка*, Фонд развіцця прававых тэхналогій

*Антаніна Елістратава*, Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Нэкст Стоп — Нью Лайф»

*Міраслаў Кобаса*, Асветніцкае грамадскае аб'яднанне «Фонд імя Льва Сапегі»

*Леанід Каліценя*, Грамадскае аб'яднанне «Цэнтр сацыяльных інавацый»

*Дзіна Шаўцова*, Грамадзянская ініцыятыва «За свабоднае веравызнанне»

*Аляксандр Каралевіч*, Грамадскае аб'яднанне «Адукацыйны цэнтр “ПОСТ”»

*Вольга Карач*, Міжнародны цэнтр грамадскіх ініцыятыў «Наш Дом»

*Сяргей Дзяжурка*, Культурна-асветніцкае грамадскае аб’яднанне “Гуманітарны мост”

*Наталля Васілевіч*, Цэнтр "Экумена"

*Тацццяна Зялко*, Ініцыятыўная група па стварэнні Грамадскага аб’яднання беларускіх пенсіянераў "Наша пакаленне"

*Ірына Жыхар*, Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын»

*Тацццяна Вадалажская*, Агенцтва гуманітарных тэхналогій

*Тацццяна Равяка,* Праваабарончы цэнтр “Вясна”

*Ганна Герасімава,* Беларускі Дом правоў чалавека ў выгнанні ў Вільні

*Аляксандр Адамянц*, Цэнтр еўрапейскіх даследаванняў

*Вольга Стужынская*, Офіс за дэмакратычную Беларусь (Брусэль)

*Іна Кулей,* Асветніцка-дабрачынная установа “Камітэт "Салідарнасць"

*Ігар Леднік*, Праваабарончы рух "Наша Беларусь"

*Аляксандр Валчанін,* Грамадскае аб’яднанне “Саюз Чарнобыль – Беларусь”

*Ірына Сухій*, Грамадскае аб’яднанне “Экадом”